Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

17 ЛЮТАГА 2017 г. ПЯТНІЦА № 33 (28397)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Службовыя раманы на тэлебачанні

СТАР. 5



Чаму людзі вераць «нігерыйскім лістам»?

СТАР. 15



Праграма тэлебачання на тыдзень

**20 КАНАЛАЎ**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Уладзімір СЯМАШКА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Абарона ўнутранага рынку і айчыннага вытворцы павінна быць у прыярытэце. Работа ў гэтым кірунку вядзецца і дае свае вынікі. Мы не павінны аддаваць свой рынак. Калі па харчовых таварах доля айчыннай прадукцыі складае 87—88%, то па прамысловых — доля айчыннага падае. Прыярытэтамі для беларускай эканомікі ў 2017 годзе таксама будуць экспарт і павышэнне канкурэнтаздольнасці тавараў. Мы — краіна з адкрытай эканомікай, і павінны ўмець прадаць 70% выраблены тавараў і паслуг. Але каб дасягнуць гэтага паказчыка, трэба быць канкурэнтаздольным — гэта пытанні якасці, канкурэнтнай цаны, сэрвісу і гэтак далей».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 17.02.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8675 | ▲ |
| Еўра | 1,9788 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0326 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0692 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# Святы абярэг Валянціны

**Жыхарка Верхнядзвінскага раёна Валянціна МАРЦІНКЕВІЧ — адна з апошніх сведак жудаснай трагедыі вёскі Росіца. Валянціна Баляславаўна і да сёння адчувае той страх, які перажыла 9-гадовай дзяўчынкай падчас фашысцкай карнай аперацыі «Зімовы цуд», якая праводзілася ў Асвейскім, Расонскім, Полацкім і Верхнядзвінскім раёнах. З таго часу прайшло 74 гады, а жанчына ў лютаўскія дні зноў і зноў чуе несціханае рэха вайны, зноў не спіць па начах... Росіцкая трагедыя адбылася 16—18 лютага 1943 года: жыхароў вёскі і навакольных паселішчаў сагналі ў касцёл, здзекаваліся з іх, потым расстрэльвалі і палілі. Больш за паўтары тысячы людзей загінула ў агні. Валянціну разам з мамай і маленькай сястрычкай павезлі ў дзіцячы канцлагер Саласпілс. Яе маці прайшла і іншыя канцлагеры — Бухенвальд і Асвенцім. У руках Валянціны Марцінкевіч часта можна ўбачыць малітоўны ружанец, які ёй падчас першага прычасця ахвяраваў ксёндз Антоній Ляшчэвіч, той самы святар, які прыняў смерць разам з парафіянамі. — Ружанец — мой анёл-ахоўнік, ён даваў мне сілы, веру, не раз ратаваў ад смерці, даў дажыць да канца вайны, — з болем і хваляваннем кажа 83-гадовая жанчына. Заўтра са сваім абярэгам Валянціна Марцінкевіч прыме ўдзел у жалобным малебне па росіцкіх ахвярах, пройдзе з іншымі вяскоўцамі дарогаю землякоў-пакутнікаў.**

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**



■ Ёсць пытанне

## «ПРАЦАВАЎ У СТРАШНЫХ УМОВАХ»

### А кампенсацыі за нявыкарыстаны адпачынак не атрымаў

**З просьбай аб дапамозе ў рэдакцыю звярнуўся пастаянны чытач «Звязды». Спадар А. (назавём яго так, бо прозвішча і зваротны адрас у друку заяўнік прасіў не згадваць) з Гродзенскай вобласці працаваў у прыватнай фірме. А калі звольніўся, наймальнік адмовіўся выплачваць яму кампенсацыю за нявыкарыстаны адпачынак. «Мне ўжо далёка не 20 і нават не 40 гадоў. За час маёй працоўнай дзейнасці ўсяго пабачыў: прэміі атрымліваў, падзякі, граматы. А бывала, што, як у песні Вілі Токарава, «меня и грабили, и просто не платили, и оскорбляли...» Але ж не да такой ступені», — пакрыўджана піша чытач.**



### Паверыў абяцанням

Але пра ўсё па парадку. На работу ў прыватную фірму спадар А. уладкаваўся 2 сакавіка 2015 года (хоць, паводле запісу ў працоўнай кніжцы, быў прыняты 15 сакавіка). Лічыўся падсобным рабочым, але на справе працаваў качагарам.

«Афіцыйны заробак у нас быў каля двух тады яшчэ мільёнаў, — расказвае ён у лісце. — За гэткія грошы і ў гэткіх страшных умовах — нават у наш час, калі работу ў вёсцы знайсці практычна немагчыма, — ніхто працаваць не будзе. І дырэктар абяцаў плаціць па колькасці напаленага вугалю: 40 тон — чатыры мільёны, 50 тон — пяць мільёнаў і г. д. І плаціў. Але не заўсёды. І не ўсім.

СТАР. 4

■ Другі шанц

## ДА «ХІМІІ» ДАВЯЛІ АЛІМЕНТЫ

### І гэтыя асуджаныя — жанчыны

**«Здараецца часам, што нейкая падзея падзяляе жыццё на «да» і «пасля». Менавіта так было ў мяне», — расказвае Жанна АНУФРЫЕВА. Жанчына трохі сарамліва пазірае на камеру фотакарэспандэнта, і гэта не дзіўна. У 55 гадоў атрымаць судзімасць і аказацца на так званай «хіміі» — напэўна, не тое, аб чым марыць большасць кабет. Зрэшты, у папраўчай установе адкрытага тыпу (ПУАТ) №51 упраўлення Дэпартамента выканання пакаранняў МУС па Мінску і Мінскай вобласці, што ў сталіцы, асуджаных з падобнымі лёсамі амаль сотня. Гэта жанчыны, якіх накіравалі суды па 174 артыкуле Крымінальнага кодэкса — за ўхіленне ад пакрыцця сродкаў на ўтрыманне дзяцей дзяржавай.**

### Калі пакаранне — дапамагае

«Усё пачалося са смерці маці, — працягвае аповед Жанна. — Мне тады было ўсяго 17 гадоў. Вельмі хутка выйшла замуж, нарадзіла дваіх дзяцей, яны ўжо дарослыя. Але адносіны не скалліся. Другі муж быў маладзейшы за мяне на сем гадоў. У гэтым шлюбе займела яшчэ дваіх сыноў. Якраз тады і пачаліся сур'ёзныя праблемы: кватэрнае пытанне, спрэчкі са свякроўю... Вырашылі так: малодшае дзіця застаецца з бацькам, а старэйшага буду выхоўваць я. Свайго жылля ў родным Бабруйску ў мяне не было, увесь час не ставала грошай. Акрамя таго, у 2006 годзе былы муж падаў на аліменты на карысць малодшага сына. З фінансавымі абавязкамі я не спраўлялася, замест афіцыйнай працы на швейнай фабрыцы хадзіла гандляваць на рынак, мне залічвалі прагулы. Так і апынулася тут».

У ПУАТ №51 жанчына знаходзіцца ўжо восем месяцаў, тэрмін пакарання скончыцца толькі ў лістападзе. Але яна спадзяецца, што атрымаць поўную свабоду зможа раней. Тым больш што на новым месцы справы, здаецца, пачалі наладжвацца. Жанну, як і іншых, уладкавалі на работу — яна прыбірае памяшканні ў інтэрнаце Мінскага мясакамбіната. На заробак жанчына не скардзіцца, кажа, што ў Бабруйску такіх грошай не бачыла. З кожнай зарплаты адпраўляе пасылкі дзецям: садавіну, цукеркі, адзенне. Найлепшая характарыстыка поспехаў — жаданне работадаўцы працягнуць стасункі: пасля завяршэння тэрміну ёй прапанавалі застацца тут і надалей у якасці вахцёра.

СТАР. 4

■ Дэкрэт №3

# ПАЧУЦЬ АДЗІН АДНАГО

## Усе пытанні можна вырашыць цывілізавана

**Учора кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля КАЧАНАВА правяла выязны прыём грамадзян у Жодзінскім гарвыканкаме. Падчас яго былі ў тым ліку разгледжаны і звароты грамадзян па пытаннях рэалізацыі нормаў Дэкрэта №3.**



Фота БЕЛТА.

— Прэзідэнт Беларусі паставіў перад намі дакладную задачу аб неабходнасці больш сур'ёзнай работы ў адносінах грамадзян. Звароты мы павінны разглядаць аператыўна і аб'ектыўна. Таму ў Адміністрацыі Прэзідэнта створана маніторынгавая група, якая будзе выязджаць у рэгіёны для таго, каб бачыць, як вядзецца работа на месцах, — адзначыла Наталля Качанава. — Не зусім правільна, калі людзі звяртаюцца ў вышэйстаячыя інстанцыі. Вырашаць праблемы павінны перш за ўсё кіраўнікі мясцовых органаў улады, прадпрыемстваў, арганізацый. Канешне, сустракаюцца і такія пытанні, якія патрабуюць садзейнічання на рэспубліканскім узроўні. Але разам з тым, калі павялічваецца колькасць паўторных або калектыўных зваротаў у вышэйшыя інстанцыі, — гэта сігнал, што на месцах не дапрацоўваюць.

**Крытэрыі цяжкай жыццёвай сітуацыі не вызначаны. Менавіта на месцах разглядаюцца ўсе канкрэтныя выпадкі і прымаюцца рашэнні.**

Адказваючы на пытанне, ці магчыма адмена Дэкрэта №3, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта заўважыла, што пачаўся толькі першы этап яго рэалізацыі. У далейшым будзе весціся маніторынг: «Мы пабачым, як працуе дакумент, якія вынікі. І пасля гэтага будзе прынята пэўнае рашэнне. У Дэкрэт ужо былі ўнесены змяненні і дапаўненні зыходзячы з тых зваротаў, якія паступалі з рэгіёнаў краіны».

Што датычыцца збору падпісаў за адмену дакумента, то, як лічыць Наталля Іванаўна, у нашай краіне мы можам добра чуць адзін аднаго. «Я думаю, мы ў стане ўсё вырашаць іншым шляхам — больш цывілізаваным. Тая работа, якая праводзіцца ў Беларусі са зваротамі грамадзян, сапраўды, вельмі сур'ёзная і няпростая. Прымаючы адпаведны закон, уносячы ў яго карэктывы, змяненні, мы зыходзім з жыцця. У нас працуюць «гарачыя» тэлефонныя лініі, на ўсіх узроўнях вядуцца прыёмы грамадзян: старшынямі аблвыканкамаў і абласных Саветаў дэпутатаў, рай-, гарвыканкамаў, райсаветаў. Кожную суботу праходзяць прамыя тэлефонныя лініі, куды можа звярнуцца любы жыхар нашай краіны і атрымаць кваліфікаваны і кампетэнтны адказ», — падкрэсліла Наталля Качанава.

Разам з тым яна засяродзіла ўвагу на тым, што прыём грамадзян — ніякая не піяр-акцыя. «Мы выязджалі на месцы і раней. І будзем надалей працягваць гэтую работу, калі ўбачым, што ў тым або іншым райцэнтры, населеным пункце найбольш вострa стаяць нейкія пытанні. У найбліжэйшы час мы запланавалі калегію ў Адміністрацыі Прэзідэнта, дзе разгледзім пытанне аб звароце грамадзян. Таму сёння праводзім маніторынг, каб падчас яго даць дакладную ацэнку той рабоце, якая вядзецца ў краіне па выкананні палажэнняў Закона аб звароце грамадзян».

Адміністрацыя Прэзідэнта вывучае і аналізуе пытанні, якія хвалююць грамадзян, у тым ліку і працоўнай занятасці. На мясцовыя органы ўлады ўскладаецца задача па стварэнні новых рабочых месцаў, прадпрыемстваў, вытворчасцяў. Сёлета плануецца адкрыць 70 тыс. рабочых месцаў. «Але некаторыя людзі проста не хочуць працаваць. Дэкрэт не нацэлены на тое, каб прымусіць кагосьці працаваць. Размова ідзе пра тое, што ўсе грамадзяне павінны ўдзельнічаць у фінансаванні дзяржаўных расходаў. На сацыяльную сферу, адукацыю, медыцыну, ахову грамадскага парадку з рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў выдаткоўваюцца значныя сродкі. Усім гэтым карыстаюцца ўсе жыхары краіны», — канстатавала кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Грамадзяне, якія не працуюць, лічаць, што яны таксама ўдзельнічаюць у фінансаванні дзяржрасходаў: набываючы тавары і прадукты ў крамах, лекі ў аптэках, карыстаючыся мабільнікамі, запраўляючы палівам аўтамабілі. «Але мы маем на ўвазе іншыя моманты. У нашай краіне пабудавана вялікая колькасць аб'ектаў сацыяльнай сферы, культуры, аховы здароўя, школ, дашкольных дзіцячых устаноў. Да 2020 года запланавана адкрыць яшчэ 70 дашкольных устаноў», — адзначыла Наталля Качанава.

Яна паведаміла, што сёння мясцовым органам улады дадзена права аб вызваленні ад аплаты збору на фінансаванне дзяржаўных расходаў. Прычым крытэрыі цяжкай жыццёвай сітуацыі не вызначаны. Менавіта на месцах разглядаюцца ўсе канкрэтныя выпадкі і прымаюцца рашэнні. Па краіне дастаткова прыкладаў, калі пры звароце ў адпаведныя камісіі пытанне вырашалася на карысць чалавека. «Гэта работа будзе працягвацца, прычым актыўна, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Мы нацэльваем Міністэрства па падатках і зборах, падатковыя інспекцыі на месцах прынесці прабачэнні тым людзям, якім памылкова былі накіраваны паведамленні. Але і тут ёсць адваротны бок. Грамадзяне атрымлівалі і «ліпавыя» паведамленні, да якіх інспекцыі не маюць дачынення. Мае месца яшчэ і нейкая спекуляцыя на гэтым пытанні з боку нядобрасумленных людзей».

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

■ Камунальныя стасункі

# Безнаяўныя жыллёвыя субсідыі змогуць атрымліваць і шматдзетныя сем'і

**Аб гэтым учора паведаміў першы намеснік міністра фінансаў Максім ЕРМАЛОВІЧ перад пачаткам выніковай калегіі ведамства з удзелам прэм'ер-міністра Андрэя Кабякова.**

У прыватнасці, першы намеснік міністра фінансаў адзначыў, што будзе пашырацца пералік катэгорый грамадзян, якім дадуць такую дзяржаўную падтрымку ў выглядзе безнаяўных жыллёвых субсідый. «Гэта будзе ўжо больш дакладны і адрасны падыход. Большую частку людзей, якія маюць патрэбу ў такой падтрымцы, мы закрываем прынятым летась рашэннем, а цяпер гаворка ідзе пра тое, каб знайсці тыя катэгорыі насельніцтва, якім агульнае рашэнне не дазваляе даваць субсідыі, але яны маюць у іх патрэбу», — падкрэсліў Максім Ермаловіч. Прадстаўнік міністра фінансаў растлумачыў, што пакуль распрацоўка новага пераліку працягваецца, але ў якасці прыкладу катэгорый, якія змогуць атрымліваць такія субсідыі, назваў шматдзетныя сем'і.

Максім Ермаловіч удакладніў, што работа па ўдасканаленні механізма безнаяўных жыллёвых субсідый ідзе ў тым ліку і ў межах падрыхтоўкі новай праграмы з МВФ. «Гэта праграма даволі складаная і ўключае ў сябе не стандартны пакет мер стабілізацыйнага характару, як праграма стэнд-бай, якую мы рэалізоўвалі ў 2009—2010 гадах, а вельмі глыбокія змены ў эканамічных адносінах паміж рознымі ўдзельнікамі гэтага працэсу. Адпаведна яна патрабуе значнай дапрацоўкі. Пазіцыя фонду нам зразумелая, таму цяпер спецыяльнымі місіямі гэтага фонду і Сусветнага банка, у тым ліку і сумесна з экспертамі МВФ, выстройваюцца пэўныя ахоўныя механізмы для насельніцтва. Гэтыя механізмы будуць накіраваны на тое, каб стварыць належную сістэму сацыяльнай абароны грамадзян пры любых зменах, якія плануецца праводзіць пры рэалізацыі праграмы структурных змяненняў у эканоміцы», — удакладніў ён.

Тут трэба адзначыць, што работа па стварэнні такіх ахоўных механізмаў актыўна вялася і на працягу 2016 года. «Акрамя стабілізацыйных мер, якія накіраваны на стабільнасць манетарнай і бюджэтнай сістэм, мы рэалізоўвалі яшчэ і дадатковыя меры сацыяльнай падтрымкі», — паведаміў Максім Ермаловіч і растлумачыў, што гаворка ідзе якраз пра сістэму безнаяўных жыллёвых субсідый. «Праводзіцца дадатковая апрабацыя гэтых метадаў, каб знізіць і бюракратычную нагрузку на грамадзян пры атрыманні такой дзярждапамогі. Гэтая работа працягваецца. У сістэму будуць уносіцца змены для таго, каб павышэнне тарыфаў, калі яно адбудзецца, на паслугі ЖКГ і транспарту не паўплывала ў значнай ступені на даходы грамадзян», — лічыць першы намеснік міністра фінансаў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Інцыдэнт

# СПРОБА ПРАВАКАЦЫІ НЕ ЎДАЛАСЯ

## МЗС каментуе падзеі мінулага пасяджэння Трохбаковай кантактнай групы

**На апошнім яе пасяджэнні група асоб з пашпартамі грамадзян Расіі і журналісцкімі пасведчаннямі выдання «Руская планета» зрабіла спробу сарваць прэс-канферэнцыю спецыяльнага прадстаўніка дзеючага старшыні АБСЕ ў Трохбаковай кантактнай групе па Украіне Марціна САЙДЗІКА. Правакатары раскідвалі лістоўкі і выкрыквалі лозунгі, якія перашкаджалі размове пасля з прадстаўнікамі СМІ. Неўзабаве парушальнікі былі аператыўна выдаленыя прадстаўнікамі праваахоўных органаў з месца правядзення мерапрыемства.**

Такім чынам, прэс-канферэнцыя ўсё ж адбылася, і прадстаўнікі СМІ атрымалі інфармацыю аб выніках работы Трохбаковай кантактнай групы ў Мінску ў поўным аб'ёме.

— Прэс-служба МЗС Беларусі расцэньвае гэтае дзеянне як свядомую правакацыю, скіраваную на зрыў перамоўнага працэсу і дыскрэдытацыю Мінскай перамоўнай пляцоўкі, — гаворыцца ў заяве знешнепалітычнага ведамства нашай краіны. — Беларускі бок будзе і надалей прымаць усе меры для забеспячэння бяспекі і бесперашкоднай работы Трохбаковай кантактнай групы.

Што да самой прэс-канферэнцыі, то бакі канфлікту ва Украіне дамовіліся развесці ўзбраенні, забароненыя мінскімі дамоўленасцямі, да 20 лютага. Пра гэта заявіў Марцін Сайдзік. «Асаблівая ўвага была ўдзелена пытанням поўнага захавання рэжыму спынення агню, развядзенню сіл і сродкаў, а таксама пытанням абароны грамадзянскага насельніцтва і жыццёва важных аб'ектаў інфраструктуры, у прыватнасці, шляхам стварэння так званых зон бяспекі вакол іх», — сказаў спецпрадстаўнік старшыні АБСЕ ў кантактнай групе.

* * *

Суд Ленінскага раёна сталіцы назначыў пяць сутак адміністрацыйнага арышту аднаму з удзельнікаў акцыі. Адпаведную інфармацыю паведаміла памочнік старшыні Мінскага гарадскога суда Анастасія Шыльвян. Удзельніка акцыі прыцягнулі па часткы 1 артыкула 23.24 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## Пуцін заявіў аб пастаянных правакацыях з боку НАТА

Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін заявіў, што пашырэнне НАТА праводзіцца з мэтай стрымлівання Расіі як асноўнай пагрозы для альянсу, Маскву пастаянна правакуюць і імкнуцца ўцягнуць у канфрантацыю, не спыняюцца спробы ўмяшання ва ўнутраныя справы краіны.

«На саміце НАТА ў ліпені мінулага года ў Варшаве ўпершыню з 1989 года Расія была прызнана асноўнай пагрозай бяспекі для альянсу, а яе стрымліванне афіцыйна абвешчана новай місіяй НАТА. З гэтай мэтай праводзіцца далейшае пашырэнне блока. Яно і раней праводзілася, але вось цяпер знайшлі іншае, больш, як ім здаецца, сур'ёзнае абгрунтаванне», — перадае РІА «Навіны» словы Пуціна на калегіі ФСБ.

«Паскорыўся працэс размяшчэння стратэгічных і звычайных узбраенняў па-за нацыянальнымі межамі вядучых дзяржаў, якія ўваходзяць у альянс»,— адзначыў Пуцін. «Нас раз-пораз, ўласна кажучы, пастаянна правакуюць і імкнуцца ўцягнуць у канфрантацыю», — заявіў прэзідэнт Расіі.

Пуцін дадаў, што «не спыняюцца спробы ўмяшання ў нашы ўнутраныя справы з мэтай дэстабілізацыі грамадска-палітычнай абстаноўкі ў самой Расіі».

## Кіраўнік МЗС Германіі лічыць, што пасляваенны светапарадак заканчваецца

Кіраўнік знешнепалітычнага ведамства ФРГ Зігмар Габрыэль заклікаў еўрапейскія дзяржавы браць на сябе больш адказнасці ў пытаннях сваёй бяспекі.

Кажучы пра неабходнасць выбудоўвання больш моцнай Еўропы, Габрыэль заўважыў, што пасляваенны светапарадак прыходзіць да свайго завяршэння, піша газета Frankfurter Allgemeine Zeitung. Ён перакананы, што прыйшоў час еўрапейскім дзяржавам браць на сябе больш адказнасці ў плане ўласнага лідарства.

Адносна адносін Германіі з Расіяй і ЗША, Зігмар Габрыэль лічыць, што палітыка павінна ўлічваць інтарэсы ўсіх бакоў, але ў той жа час не быць «наіўнай».

## Чэрчыль прадказаў існаванне іншапланецян



Амерыканская вучоныя знайшлі невядомы раней рукапіс экс-прэм'ера Вялікабрытаніі сэра Уінстана Чэрчыля, у якім ён разважае пра магчымасць існавання жыцця па-за межамі Зямлі.

У аглядзе артыкула брытанскага палітыка, апублікаваным амерыканскім часопісам Nature, адзначаецца сучасны лад мыслення аўтара, які грунтаваўся на некалькіх базавых ідэях: неабсяжнасці Сусвету, неабходнасці вады для зараджэння жыцця і панняцці «заселенай зоны», якое прадугледжвае тэмпературны фактар і неабходнасць наяўнасці гравітацыі для фарміравання атмасферы.

З улікам выкладзенага Уінстан Чэрчыль прыйшоў да высновы: «Ёсць шанцы, што існуюць планеты, умовы на якіх не выключаюць магчымасць існавання жыцця».

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў выказваюць глыбокае спачуванне дырэктару Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Іпатаву Вадзіму Дзмітрыевічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

■ У новым фармаце

# Зачын на будучыню

## У сталіцы прайшоў першы рэспубліканскі кар'ерны форум

**На мерапрыемства былі запрошаны прадстаўнікі вядомых айчынных і замежных кампаній — у выніку было прадстаўлена больш чым тры дзясяткі стэндаў. Форум наведалі больш за паўтары тысячы студэнтаў з розных ВНУ.**


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

— Раней наш універсітэт праводзіў так званыя Дні кар'еры, — адзначыў **рэктар БДУ Сяргей АБЛАМЕЙКА.** — Але штогод колькасць ахвотных наведаць гэтыя мерапрыемствы, як з боку студэнтаў, так і работадаўцаў, павялічвалася. Таму мы дамовіліся з Міністэрствам адукацыі аб правядзенні форуму рэспубліканскага маштабу, на які запрасілі студэнтаў з іншых ВНУ. Наколькі мне вядома, паступіла нямала заявак з рэгіянальных універсітэтаў, ёсць і госці з замежжа: Арменіі, Італіі, Чэхіі. Можна канстатаваць, што цікаўнасць да такіх сустрэч не змяншаецца, і мы рады, што атрымліваем шмат станоўчых водгукаў.

Аднак колькасць удзельнікаў — не адзінае адрозненне мерапрыемства ў новым фармаце ад звыклых Дзён кар'еры. Акрамя дыялогу з патэнцыйнымі работадаўцамі, наведвальнікі маглі паслухаць майстар-класы на самыя розныя тэмы: ад правіл складання рэзюмэ да тэндэнцый беларускага рынку працы і прафесій, якія стануць запатрабаванымі ў недалёкай будучыні. Акрамя таго, у праграме Рэспубліканскага кар'ернага форуму былі так званыя «спід-дэйцінгі» (кароткія размовы з работадаўцамі), лабараторыя дызайн-мыслення, дзе кожны ахвотны мог паспрабаваць сябе ў распрацоўцы інавацыйных рашэнняў для вядомых кампаній, а таксама панэльная дыскусія, падчас якой абмяркоўваліся шляхі скарачэння адлегласці паміж акадэмічнай адукацыяй і патрэбамі бізнесу.

— Я вырашыў наведаць гэты форум, бо спадзяюся знайсці сабе месца працы, дзе змагу прымяніць атрыманыя на вучобе навыкі, — расказаў **студэнт другога курса геаграфічнага факультэта БДУ Арцём ПАБЯРЭЖНІ.** — Таксама хачу зразумець, якіх ведаў не хапае, каб быць запатрабаваным спецыялістам. Мяне найбольш цікавіць прымяненне геаінфармацыйных сістэм у прамысловасці. Гэта сфера, якая знаходзіцца на перасячэнні геаграфіі і інфарматыкі. Напрыклад, складанне інтэрактыўных картаў ці нешта падобнае.

— Прыехала сюды, бо цяпер знаходжуся ў пошуку варыянтаў для будучага размеркавання, — падзялілася **студэнтка чацвёртага курса Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта Кацярына МАЁРАВА.** — Шчыра кажучы, непасрэдна па маёй сферы — нафтахімічнай прамысловасці — варыянтаў тут няшмат. Найбольш стэндаў кампаній, звязаных з інфармацыйнымі тэхналогіямі. Але я не засмучаюся, бо паралельна праходзяць майстар-класы і гутаркі, а гэта таксама вельмі карысны досвед, які мне абавязкова спатрэбіцца.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

■ Анонс

# У Дальву — праз Хатынь

**Традыцыйны агітпрабег «Лагойск — Хатынь — Дальва», прысвечаны Дню абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Беларусі, адбудзецца ў гэтую суботу, 18 лютага. Пачатак — у 11.00.**

Школьнікі Акалоўскай і Задор'еўскай сярэдніх школ, Засоўеўскага дзіцячага сада — базавай школы Лагойскага раёна, навучэнцы вучылішча алімпійскага рэзерву з Плешчаніц, а таксама вайскоўцы Лагойшчыны паспаборнічаюць за лідарства падчас прабегу. Пераможцы атрымаюць памятныя прызы. Пасля ў Дальве адбудзецца ўрачысты мітынг-рэквіем. Арганізатары мерапрыемства — мемарыяльны комплекс «Хатынь», Лагойскі райвыканкам і Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія.

Зімовы агітпрабег па гэтых мясцінах ладзіцца ўжо 43-ці раз. Такое рашэнне было прынята пасля таго, як у 1973 годзе ў Дальве ўзнік мемарыял. Гэта апошняя вёска, спаленая гітлераўцамі разам з людзьмі падчас Другой сусветнай вайны. 19 чэрвеня 1944 года — за некалькі дзён да вызвалення сталіцы — у Дальве зажыва згарэлі 44 чалавекі. Сярод іх было 29 дзяцей... Адзіным жыхаром вёскі, які выжыў, быў Мікалай Гірыловіч. У той дзень ён пасвіў каня. Трагедыю, у якой не стала бацькоў і трох братоў, бачыў на свае вочы. Але нічога зрабіць не мог... Многія гады Мікалай Гірыловіч марыў паставіць на брацкай магіле аднавяскоўцаў помнік. І амаль праз 30 гадоў пасля трагедыі дзякуючы гэтаму чалавеку, які ўсё далейшае жыццё прысвяціў захаванню памяці аб сваіх земляках, у Дальве адкрыўся мемарыял.

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*

# Хутка наваселле

## Два новыя дзіцячыя садкі будуюцца ў Гродне

**Як паведамілі ва Упраўленні капітальнага будаўніцтва горада Гродна, адкрыццё дзіцячай дашкольнай установы ў мікрараёне Паўднёвы-5 намечана на чэрвень. Яе праект такі ж, як і пабудаванага дзіцячага садка на 230 месцаў у сталічным жылым раёне Каменная Горка.**

Узводзіць аб'ект Гроднапрамбуд. Цяпер на будоўлі задзейнічана каля ста чалавек. У будынак пасля ўстаноўкі шклопакетаў і вонкавых дзвярэй пададзена цяпло — гэта дазволіла распачаць тынкавальныя работы, заліўку падлогі, мантаж электраправодкі. На тэрыторыі дзіцячага садка ўстанаўліваюцца ценявыя навесы.

Будоўля дзіцячага садка ў мікрараёне Альшанка.


Фота Міхаіла ІСАЧАНКІ.

У мікрараёне Паўднёвы-3 таксама ідуць работы па будаўніцтве аналагічнага дзіцячага садка, адкрыццё якога запланавана на канец года.

Увогуле ж, у Гродзенскай вобласці ў 2016 годзе дадаткова створана больш за 1,2 тыс. месцаў у дзіцячых садках. Пра гэта, каментуючы выступленне Прэзідэнта на сустрэчы з прадстаўнікамі грамадскасці, беларускіх і замежных СМІ, паведаміў **намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар ЛІСКОВІЧ.** Сёння на Гродзеншчыне ўсе дзеці ва ўзросце ад 3 да 6 гадоў забяспечаны месцамі ў дашкольных установах. Зроблена гэта не толькі за кошт узвядзення новых аб'ектаў, але і дзякуючы перапрафіляванню памяшканняў, аптымізацыі існуючых груп, адкрыццю груп на базе іншых устаноў адукацыі. Прычым стараліся гэтыя месцы з такім разлікам, каб ніякім чынам не ўшчаміць дзяцей у камфорце.

**Мікалай ШЛЫК.**

# ЗАПРАШЭННЕ ДА ВЯЛІКАГА ШОЎКАВАГА ШЛЯХУ

**У Алматы (Рэспубліка Казахстан) з 6 па 8 красавіка пройдзе IX Міжнародная кніжная і паліграфічная выстаўка «Па Вялікім Шоўкавым шляху».**

Да ўдзелу ў свяце кнігі запрошаны і беларускія выдаўцы і паліграфісты. Арганізатар выстаўкі — Асацыяцыя выдаўцоў, паліграфістаў і кнігараспаўсюджвальнікаў Казахстана. Падтрымку ў рэалізацыі праекта аказвае Міністэрства культуры і спорту Рэспублікі Казахстан. Плануецца правядзенне прэзентацый, семінараў, круглых сталоў, прысвечаных актуальным праблемам развіцця ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва ў галіне кнігавыдання, кнігараспаўсюджвання і паліграфіі. У Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь перакананы, што нашай краіне будзе што паказаць гаспадарам, наведвальнікам выстаўкі. Апошнімі гадамі ў Мінску пабачылі свет кнігі казахскіх пісьменнікаў у перакладзе на беларускую мову. Толькі ў Выдавецкім доме «Звязда» выйшлі тры кнігі вучонага, асветніка, публіцыста Немата Келімбетава — «Не хачу губляць надзею», «Лісты да сына», «Зайздрасць», а яшчэ зборнік вершаў легендарнага Абая «Стэпавы прастор». У беларускіх літаратурна-мастацкіх часопісах, газеце «Літаратура і мастацтва» надрукаваны паэзія і проза пісьменнікаў Казахстана — Амантая Ахетава, Любові Шашковай, Святланы Ананьевай, Валерыя Міхайлава, Нурлана Аразаліна, Галыма Жайлыбая, Райхан Мажэнкызы і інш. Актыўна супрацоўнічаюць паміж сабой казахстанскі штомесячнік «Простор» і беларускі часопіс «Нёман».

**Сяргей ШЫЧКО.**

# У ПОЛІ ЗРОКУ — СУСВЕТНАЯ МЕДЫЙНАЯ ПРАСТОРА

**У Інстытуце журналістыкі БДУ прайшла VI Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Міжнародная журналістыка — 2017: ідэя інтэграцыі інтэграцый і медыя».**

Прывітанне канферэнцыі адрасавала **міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Лілія АНАНІЧ**. Традыцыі ўвагі беларускіх даследчыкаў да сусветнай медыйнай прасторы досыць даўнія і трывалыя. У Інстытуце журналістыкі працуе моцная кагорта даследчыкаў замежных мас-медыя, стасункаў з імі айчынных газет, часопісаў, радыё, тэлебачання. Міністр інфармацыі, у прыватнасці, у сваім прывітальным слове адзначыла: «Ва ўмовах дынамічнага развіцця інфармацыйнай прасторы бачыцца асабліва актуальным навуковае забеспячэнне фундаментальных і прыкладных пытанняў міжнароднай журналістыкі, дзейнасці сродкаў масавай інфармацыі. Упэўнена, што канферэнцыя паспрые рэзультатыўнаму абмеркаванню важнейшых праблем сучаснай медыясферы...»

— У госці да нас прыехалі навукоўцы з 11 краін, — расказвае **дырэктар Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Сяргей ДУБОВІК**. — Удзел у канферэнцыі прынялі даследчыкі, эксперты з Расіі, Украіны, Казахстана, Кітая, Францыі, Ірака, Ірана і інш. Як правіла, усе — нашы даўнія партнёры, навукоўцы, з якімі мы кантактуем па многіх пытаннях. Асаблівая ўвага многіх удзельнікаў канферэнцыі нададзена беларуска-кітайскім медыйным стасункам, СМІ ў Кітаі і іх ролі ў асвятленні тэмы развіцця Эканамічнага пояса Шоўкавага шляху.

**Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

■ Надвор'е

# ЧАС РАНІШНЯЙ СЛІЗГОТЫ

## А на наступным тыдні невялікі плюс чакаецца нават уначы

**У гэтыя выхадныя на тэрыторыі Беларусі чакаецца няўстойлівае надвор'е, калі амаль паўсюдна па краіне прагназуюцца мокры снег і дождж, паведамляе намеснік начальніка службы метэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Святлана РЫБАКОВА.**



Мокры снег з дажджом прыйдзе да нас ужо сёння. Магчымы слабы туман і галалёд, на асобных участках дарог галалёдзіца. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе ад 1 градуса марозу да 4 цяпла. У выхадныя на тэрыторыю Беларусі завітаюць атмасферныя франты, якія «прынясуць» няўстойлівае надвор'е. У суботу ўначы ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу прагназуюцца на большай частцы тэрыторыі краіны, а ўдзень — толькі па паўднёвым усходзе. Паўсюдна слабы туман і галалёд. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ў межах ад мінус 3 градусаў да 2 цяпла, удзень — ад мінус 1 градуса да 4 цяпла. Спецыялісты адзначаюць, што надвор'е яшчэ больш пагоршыцца, калі ў нядзелю да нас завітае чарговая франтальная сістэма з поўдня Скандынаўскага паўвострава. Таму ўначы ў нядзелю ў крайніх паўночназаходніх раёнах, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі Беларусі пройдуць мокры снег і дождж, слабы туман і галалёд. Удзень будзе моцны парывісты вецер. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 градусаў да 1 цяпла, а ўдзень — ужо ад 1 марозу да плюс 4 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у першыя дні наступнага тыдня надвор'ем у Беларусі будуць кіраваць атмасферныя франты, якія пачнуць рухацца да нас з боку Заходняй Еўропы, а таксама і цёплыя паветраныя масы атлантычнага паходжання. У панядзелак на большай частцы тэрыторыі краіны пройдзе мокры снег з дажджом, уначы і раніцай магчымы слабы галалёд. Моцны парывісты вецер. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 градусаў да плюс 2, удзень — ад нуля да 5 цяпла. Сіноптыкі адзначаюць, што ў аўторак стане крыху цяплей. Прагназуюцца кароткачасовыя ападкі (уначы мокры снег, удзень — пераважна дождж) і слабы галалёд. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад мінус 5 градусаў да плюс 2, удзень — ад нуля да 6 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# «ПРАЦАВАЎ У СТРАШНЫХ УМОВАХ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Прапрацаваў я там амаль 11 месяцаў. Затрымаўся б і даўжэй, бо альтэрнатывы не было. Але надакучылі пастаянныя прыдзіркі майстра, і я кінуў работу. Разумеў, што маглі звольніць за прагулы, але гэтага не зрабілі. Зрабілі іншае. Калі я сам падпісаў афіцыйную заяву на звальненне і атрымаў канчатковы разлік, убачыў, што мне не заплацілі не толькі абяцанае «ў канверце», але і кампенсацыю за нявыкарыстаны адпачынак.

Спытаў у майстра. Той адказаў, што ні пры чым. Патэлефанаваў дырэктару фірмы, а ён заявіў: «Скажы дзякуй, што і гэта заплацілі. А пачнеш шукаць праўду, мы напішам на цябе акт, што ты быў п'яны ці адсутнічаў і па тваёй віне згарэў вугаль. І ты мне да смерці будзеш вінен».

Спадар А. спадзяваўся, што кіраўніцтва замучыць сумленне і грошы яму вернуць. Але цуду не здарылася. У пачатку жніўня мінулага года мужчына пайшоў на кансультацыю да пракурора. Той параіў напісаць скаргу ў міжраённую інспекцыю па працы. Звяртаўся чытач і ў Мінскае гарадское ўпраўленне Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы (бо фірма зарэгістравана ў сталіцы), і ў Міністэрства па падатках і зборах. Праўда, увагу ведамстваў больш прыцягнуў факт выплаты заробку «ў канвертах», які ўсё роўна не атрымалася даказаць. Бо «з прадстаўленых у інспекцыю дакументаў вынікае, што грашовыя сродкі налічваліся работнікам арганізацыі і выплачваліся згодна з ведамасцямі праз касу».

**Каб спагнаць кампенсацыю за нявыкарыстаны адпачынак, можна звярнуцца да натарыуса па выканаўчы надпіс, у камісію па працоўных спрэчках (калі такая ёсць на прадпрыемстве), падаць іск у суд.**

«А чаму не звярнулі ўвагі на тое, што я скардзіўся на бесчалавечнае стаўленне да людзей, на адсутнасць санітарных нормаў, на грубае парушэнне тэхнікі бяспекі і пажарнай бяспекі і, у рэшце рэшт, што для мяне самае галоўнае, на нявыплачаную мне кампенсацыю?» — задаецца пытаннем спадар А.

## Грошы верне суд?

Выплаціць супрацоўніку ўсе належныя сумы наймальнік абавязаны ў дзень звальнення. Канчатковы разлік уключае запазычанасць па заработнай плаце, кампенсацыю за нявыкарыстаныя дні адпачынку, выходную дапамогу і іншае.

— Каб пазбегнуць адказнасці за несвоечасовы разлік работніка пры звальненні, наймальнікі звяртаюцца да розных хітрасцяў, — папярэджвае **адвакат па працоўных спрэчках Мінскай гарадской калегіі адвакатаў Уладзімір ПУНЬКО**. — Напрыклад, не скасоўваюць кантракт і не выдаюць працоўную кніжку, а прапануюць напісаць заяву на адпачынак за свой кошт, пакуль у арганізацыі не з'явяцца грошы на выплату заробку. У сітуацыі рэальнага скарачэння штату звальняюць па пагадненні бакоў, каб не выплачваць выхадную дапамогу. Ці не выдаюць патрэбныя дакументы.

Згодна з артыкулам 179 Працоўнага кодэкса кампенсацыя за нявыкарыстаны адпачынак выплачваецца незалежна ад падставы звальнення. На яе могуць прэтэндаваць і сезонныя работнікі, і тыя, хто быў заняты па сумяшчальніцтве. Права на гэтыя выплаты ўзнікае, калі чалавек адпрацаваў у наймальніка больш за 15 дзён, якія ўключаюцца ў працоўны год. Калі да звальнення работнік адпрацаваў няпоўны год, сума кампенсацыі вызначаецца прапарцыянальна адпрацаванаму часу. Пры гэтым мінімальны адпачынак складае 24 дні (гэтыя дні ўключаюцца ў працоўны год).

Каб спагнаць кампенсацыю за нявыкарыстаны адпачынак, можна звярнуцца да натарыуса па выканаўчы надпіс, у камісію па працоўных спрэчках (калі такая ёсць на прадпрыемстве), падаць іск у суд. Пры гэтым, адзначае Уладзімір Пунько, работнікі вызваляюцца ад аплаты дзяржпошліны за падачу іску і судовых выдаткаў.

Ва ўпраўленні па працы, занятасці і сацыяльнай абароне райвыканкама па месцы жыхарства спадара А., пачуўшы яго гісторыю, здзівіліся: чаму мужчына перш-наперш не звярнуўся да іх?

— Мы яму гатовы дапамагчы: звязацца з наймальнікам, сабраць неабходныя дакументы. Няхай прыходзіць, — адказалі ва ўпраўленні і запэўнілі, што і наш чытач, і іншыя грамадзяне, якія сутыкнуліся з такой сітуацыяй, могуць звяртацца па кансультацыю ў мясцовыя органы па працы.

Праўда, ці не будзе позна? Тэрмін даўнасці па справах аб спагнанні выплат пры звальненні складае тры месяцы з дня звальнення. А ў сітуацыі спадара А. прайшоў амаль год. Хоць у выпадку пропуску тэрміну даўнасці з уважлівых прычын ён можа быць аднаўлены судом.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
lubneuskaya@zviazda.by

# ДА «ХІМІІ» ДАВЯЛІ АЛІМЕНТЫ



**Аднавіцца ў бацькоўскіх правах — мара Вольгі Аляксеенкі. Але пакуль што гатаваць даводзіцца толькі для сябе і іншых асуджаных.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Калі я даведалася, што мяне шукае міліцыя, што не проста спужалася — гэта была сапраўдная трагедыя, — прызнаецца Жанна. — Думала, што жыццё, фактычна, скончылася, бо я ніколі не мела праблем з праваахоўнікамі, а тут — такое. Але цяпер разумею, што далёка не ўсё страчана. Наадварот, праведзены тут час даў мне магчымасць падумаць, як жыць далей. Дарэчы, вельмі дапамаглі дзяўчаты, якія таксама адбываюць пакаранне, — у калектыве цяжкасці пераносіць прасцей. Безумоўна, часта думаю, што калі была б магчымасць, я зрабіла бы ўсё інакш. Цяпер малодшы сын стасункаў не падтрымлівае, крыўдуе на мяне. Можа, атрымаецца пабудаваць адносіны нанова пасля сканчэння тэрміну...»

## Даць магчымасць выгаварыцца

У памяшканне на вуліцы Кабушкіна гэта папраўчая ўстанова пераехала ў мінулым лістападзе. Будынак адрамантавалі, таму ўмовы тут выдатныя: у жылых пакоях новая мэбля, гаспадарчы блок абсталяваны якаснай бытавой тэхнікай. Калі б не жорсткі рэжым і кантроль (напрыклад, ранішнія і вячэрнія паверкі), можна было б зблытаць установу з інтэрнатам. Між іншым і плаціць за яе даводзіцца гэтак жа, як за любое жыллё, — з кожнага заробку асуджаная аддаюць каля 25 рублёў за пражыванне. Харчуюцца, вядома, таксама за ўласныя грошы — ёсць свая кухня.

Але абмежаванні таксама даволі сур'ёзныя. Жыццё тут праходзіць строга па графіку: пад'ём у 6 раніцы, падрыхтоўка да работы і ад'езд, пасля вяртання — вячэрні туалет, харчаванне і адбой у 10 вечара. Адлучыцца куды-небудзь нават на выхадных можна толькі па ўзгадненні з адміністрацыяй. З бытавой тэхнікі ў жылым блоку дазволена карыстацца толькі самымі незаменнымі рэчамі. У гэтым выпадку, напрыклад, такімі важнымі для жанчын прасікамі для валасоў ці фенамі. Прагляд тэлевізара — толькі цэнтралізавана ў пакоі адпачынку. А вось мабільным тэлефонам карыстацца не забаронена.

Асноўная частка асуджаных уладкавана на ААТ «Смалявічы Бройлер» (штораніцы па работніц прыязджае аўтобус, які ўвечары прывозіць іх назад), астатнія — на Мінскім мясакамбінаце, у Нацыянальнай бібліятэцы, Белтэлерадыёкампаніі і Белдзяржфілармоніі.

«Параўноўваць нашу ўстанову з папраўчымі калоніямі, я лічу, некарэктна, — сцвярджае **начальнік ПУАТ №51 Дзмітрый БАРЫСЕНКА**. — Яны зусім розныя па сваёй сутнасці, хоць мэта ў нас адна — выпраўленне асуджаных. Але тут адбываюць пакаранне зусім іншыя людзі, тыя, хто здзейсніў «бяспечныя» правапарушэнні. Для іх абмежаванне свабоды мае шэраг пераваг. Тут чалавек не адрываецца ад грамадства, працягвае весці амаль звычайнае жыццё. Ці здараецца такое, што асуджаныя па ўласным жаданні пакідаюць установу? Вядома, такія выпадкі маюць месца, але гэта, хутчэй, выключэнні з правілаў. Тым больш што ў нас пакаранне адбываюць жанчыны, а яны больш ураўнаважаныя, разумеюць, што гэта толькі прывядзе да больш сур'ёзных праблем. У мяне быў досвед работы ў аналагічнай мужчынскай установе, таму магу параўноўваць. Мужчыны трымаюць усё ў сабе, вось і эксцэсаў здараецца больш. Напрыклад, жонка напісала нешта дрэннае — ён пайшоў заліваць гора алкаголем ці ўвогуле збег з установы. А жанчынам трэба, каб было каму выгаварыцца, расказаць пра сваю праблему. Менавіта для гэтых мэт у нас у штаце працуе псіхолаг».

## Ахвяры ці прыклады безадказнасці?

**Вольга АЛЯКСЕЕНКА** таксама выйшла замуж дастаткова рана — у 19 гадоў. У шлюбе, які, па яе словах, быў шчаслівым, нарадзілася ажно пяцёра дзяцей. Але скончылася ўсё трагічна — мужа цяперашняй асуджанай забілі. На пытанне, як гэта здарылася, жанчына адказвае туманна: «Так бывае».

«З гэтага моманту ўсё змянілася, — кажа Вольга. — Было вельмі цяжка адной з пяцярымі дзецьмі на руках. У выніку, як кажуць, «пайшла па крывой дарожцы». Пачала праводзіць час не ў тых месцах і не з тымі людзьмі. За дзецьмі сачыць перастала. У выніку мяне пазбавілі бацькоўскіх правоў, дзяцей перадалі пад апякунства свекрыві, а аліменты я не плаціла».



**Яскравы прыклад таго, як пакаранне можа змяніць жыццё да лепшага, — Жанна Ануфрыева.**

У папраўчай установе жанчына аказалася ўсяго месяц таму, у яе тэрмін — два гады і дзесяць дзён. Але Вольга запэўнівае, што нават за гэты час яна сур'ёзна перагледзела свае погляды на жыццё. Жанчына кажа, што хоча аднавіцца ў бацькоўскіх правах, тым больш што з дзецьмі яна ўвесь час падтрымлівае кантакт. Кожны дзень з імі сазвоньваецца, цікавіцца вучобай і іншымі справамі... Чаму не цаніла тое, што было раней? Гэтага Вольга патлумачыць не можа, але абяцае, што далей усё будзе інакш. А яшчэ прызнаецца: была ўпэўнена, што ў папраўчай установе ўсё так, як у самых горшых фільмах пра турму. Сказаць, што чаканні не спраўдзіліся — не сказаць нічога.

Зрэшты, пераважная частка асуджаных наракае выключна на жыццёвыя абставіны. Вось і **Кацярына ПАПОВА** сцвярджае, што яе сітуацыя склалася «сама па сабе». У Беларусь яна прыехала з Расіі, з Кемерава, і блізкіх родзічаў тут, акрамя маці, не мае. У шлюбе нарадзіла дваіх сыноў, адзін з якіх хварэе на дзіцячы цэрэбральны параліч. У дадатак муж трапіў у турму, і жанчына засталася з усімі праблемамі сам-насам. Пакуль Кацярына шукала грошы, дзеці заставаліся дома. Старэйшы сын не з'яўляўся ў школе, і сітуацыяй зацікавіліся органы апекі. У выніку маці пазбавілі бацькоўскіх правоў, а потым і асудзілі па 174-м артыкуле.

«Знаходжуся тут ужо месяц з прадпісаных васямнаццаці, — расказвае Кацярына. — Уладкавалася прыбіральшчыцай у адзін з гіпермаркетаў непадалёк. Зарплату яшчэ не атрымлівала, але абяцаюць каля 400 рублёў. Адзінае, чаго цяпер хачу, — уз'яднацца з дзецьмі, бо «мама на выхадных» гэта



**Кацярына Папова аказалася на «хіміі» пасля таго, як за краты трапіў муж.**

не тое, пра што я марыла. Не магу сказаць, што раней не думала пра магчымыя праблемы, разумела, што да дабра гэта не давядзе. Але нічога зрабіць не магла. Цяпер вось плануем, на што размяркую першы заробак, — прыглядзела сынам падарункі на 23 лютага.

## Перавыхавацца — магчыма

Максімальны тэрмін у папраўчых установах адкрытага тыпу — пяць гадоў. Але самыя распаўсюджаныя пакаранні па 174-м артыкуле складаюць паўтара-два гады. Тым не менш нават такі адносна невялікі час абмежавання волі можа сур'ёзна паўплываць на маральны стан чалавека. Каб гэтага не здарылася, ва ўстанове перыядычна праводзяцца «дні атрадаў», калі асуджаныя даюць канцэрт для сваіх блізкіх, а потым могуць правесці час у пакоях за кубкам гарбаты. Увогуле ж наведванні блізкімі тут неабмежаваныя.

Таксама асуджаныя перыядычна наведваюць Вялікі тэатр оперы і балета, арганізавана ходзяць у музеі і на выставы ў горадзе. Раз на тыдзень наведваюць царкву. Незадоўга да нашага візіту ва ўстанову прыязджала жыхарка Баранавіч, якая мае шаснаццаць дзяцей (двое біялагічных і чатырнаццаць прыёмных), і разам з імі давала для жанчын канцэрт. Таму культурная работа тут праводзіцца на ўзроўні. Але ці гарантуе гэта, што чалавек не вернецца да ранейшага ладу жыцця?

«Вядома, ёсць у нас і «пастаянныя кліенты», тыя, хто раз за разам вяртаецца ва ўстанову да дасягнення пенсійнага ўзросту. Чалавек гасіць сваю запазычанасць перад дзяржавай, вяртаецца ў ранейшыя ўмовы, і ўсё паўтараецца зноў, — кажа Дзмітрый Барысенка. — Але пераважная большасць асуджаных, безумоўна, выпраўляецца, і больш з гэтымі людзьмі не сустракаемся».

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
lyskavets@zviazda.by



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Не ведаючы, хто насяляе гэта памяшканне, можна зблытаць яго з пакоем у інтэрнаце.**

ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV@R

# Раман з кадрам

**Тэлераман — гэта, наогул, фармат тэлевізійных шматсерыйных фільмаў родам з французскай Канады, аналаг лацінаамерыканскіх «мыльных опер». Аднак, пакуль яшчэ канчаткова не развеяўся ў шэрых буднях рамантычны флёр Дня ўсіх закаханых, успомнім пра іншыя тэлевізійныя раманы са шчаслівым фіналам — гісторыі вядомых сямейных пар, якія склаліся ўнутры або дзякуючы тэлебачанню.**

## СМЕХ, СЯБРОЎСТВА, РОК-Н-РОЛ

Ён — тэлерэжысёр, кліпмейкер і меламан са стажам, яна — журналістка і вядучая музычных тэлепраграм, а ў тандэме яны не толькі бацькі дзвюх дачок, але і стваральнікі шэрагу папулярных праектаў і «хросныя феі» мноства беларускіх артыстаў і калектываў. Яны разам — можна па-добраму пазайздросціць — 26 гадоў! «Плюс яшчэ год «у граху», — іра-



нічна ўдакладняе **Аксана Вечар**. Прычым «разам» — увесь гэты час літаральна 24 гадзіны ў суткі, і на працы, і дома. Зразумела, многім з нас таксама хацелася б валодаць сакрэтам трывалай сям'і: як за такі працяглы час не стаміцца адно ад аднаго?

— А тут расказваць няма чаго, — сцвярджае Аксана Вечар. — За ўсе мінулыя гады мы кожны год, уявіце, умудраліся забыцца пра дзень уласнага вяселля. Успаміналі праз тыдзень, праз некалькі дзён, у лепшым выпадку назаўтра, а саму дату, як назнарок, прапускалі — хіба што на 15 і 25 гадоў паставілі сабе гэткія памятныя зарубкі на мозг, каб больш ці менш урачыста адзначыць... Гэта я да чаго вяду: мы не адчуваем, што мінула «стольki часу», мы яго наогул не заўважаем. Напэўна, уважліва сочыш за часам і вядзеш яго ўлік, калі цябе нешта стамляе — а ў нашым выпадку ўсё адбываецца неяк само сабой... Але, безумоўна, гэткае маё трансцэндэнтальнае тлумачэнне не адмяняе простых, прыземленых рэчаў. Напрыклад, таго, што ў сям'і патрэбна бязмежнае цярпенне — вядома, мы не такая ідэальная пара, што без адзінага папроку вытрымае 24 гадзіны твар да твару, проста мноства нашых спрэчак застаецца «за кадрам». І ўсё ж чым растлумачыць, што за больш як чвэрць веку мы не стаміліся быць побач? Ведаеце, ёсць такі цудоўны фільм «Хто падставіў труса Роджэра», і калі ў мульцяшнай прыгажуні Джэсікі Рэбіт пытаюцца, што яна знайшла ў трусіку, тая адказвае: «Вы не разумееце — з ім весела!» Гэта фармулёўка насамрэч многае тлумачыць, у прыватнасці, у маім выпадку. Бо каханне — такая рэч, якая з часам трансфармуецца ў нешта іншае, але гэта разумееш толькі з узростам. Нядаўна **Толя** мне сказаў: «Аксанка, ты такі класны сябар!» І гэта, між іншым, таксама дарагога каштуе, бо іншае сяброўства лепшае за падлеткавыя міламанні...

***— Мабыць, за столькі гадоў у вашай сям'і склаліся агульныя звычкі, традыцыі?***

— Мы ў гэтым сэнсе зусім няўдзячная пара: ніякіх там абавязковых нядзельных абедаў з дзецьмі або вячэрніх пасядзелак пры свечках з келіхам віна — усе гэтыя рамантычныя кіношныя штампы прайшлі міма нас, — смяюцца Вечары.

## А ПЕСНІ — ДАВОЛІ АДНОЙ

| 17 | Грузовой Урал-4320-0710 ш. 087792 дв. б/н 1987 г. *4 кат. 119 043 км* | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 7 900 | 790 |
| 18 | Седельный тягач КамАЗ-54112 ш. 0019127 дв. 0352787 1988 г. *4 кат. 35 204 км* | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 4 500 | 450 |
| 19 | Автошасси МАЗ-543М ш. ТМ2ТР2120290 дв. 9001К00596 1990 г. *4 кат. 29 271 км* | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 9 000 | 900 |
| 20 | Грузовой Урал-4320-0710-01 ш. 101231 дв. 674225 1988 г. *4 кат. 66 915 км* | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 5 000 | 500 |
| 21 | Смазка Литол-24 в бочках некондиция (по 173 кг в бочке) 1983 г. Бочка БС-200 со с/дн 1983 г. 2 кат. Партия 200 бочек | н.п. Красн. Берег в/ч 55461 | 18 300 | 1 830 |
| 22 | Смазка Литол-24 в бочках некондиция (по 173 кг в бочке) 1983 г. Бочка БС-200 со с/дн 1983 г. 2 кат. Партия 200 бочек | н.п. Красн. Берег в/ч 55461 | 18 300 | 1 830 |
| 23 | Смазка Литол-24 в бочках некондиция (по 173 кг в бочке) 1983 г. Бочка БС-200 со с/дн 1983 г. 2кат. Партия 200 бочек | н.п. Красн. Берег в/ч 55461 | 18 300 | 1 830 |
| 24 | Смазка Литол-24 в бочках некондиция (по 173 кг в бочке) 1983 г. Бочка БС-200 со с/дн 1983 г. 2 кат. Партия 200 бочек | н.п. Красн. Берег в/ч 55461 | 18 300 | 1 830 |
| 25 | Смазка Литол-24 в бочках некондиция (по 173 кг в бочке) 1983 г. Бочка БС-200 со с/дн 1983 г. 2 кат. Партия 200 бочек | н.п. Красн. Берег в/ч 55461 | 18 300 | 1 830 |
| 26 | Смазка Литол-24 в бочках некондиция (по 173 кг в бочке) 1983 г. Бочка БС-200 со с/дн 1983 г. 2 кат. Партия 171 бочка | н.п. Красн. Берег в/ч 55461 | 15 646.5 | 1 565 |

**Аукцион** состоится по адресу: г.Минск, ул.Казинца, д.2, 6-й этаж, **23 марта 2017 г. в 11.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительские и другие необходимые документы до **17.00 20 марта 2017 года**.

Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться **23 марта 2017 г. с 9.00 до 9.45.**

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона**.**

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5** банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10** банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусского рубля и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: белорусские рубли – 3012244970018 в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр. Машерова, 29, код 153001739, российские рубли – 3012107883087 в Центре банковских услуг №701,ОАО»БПС-Сбербанк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, код 369, УНН 101099370, ОКПО 37401662 Корреспондент-Сбербанк России г. Москва, № корсчета 30111810100000000090. Реквизиты банка: БИК 044525225 ИНН 7707083893 к/с в ОПЕРУ Московского ГТУ Банка России №30101810400000000225, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС**. **Справки по тел.: (017) 398 07 81, факс (017) 398 07 81. Наш адрес в Интернете: www.bsk.by, auk@bsk.by**

# Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| ЛОТ 1 | |
| Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения | Незавершенное законсервированное капитальное строение, инв. №422/U-39260 (назначение – здание неустановленного назначения, наименование – незавершенное законсервированное капитальное строение), площадью 0,0 кв. м, расположенное по адресу г. Щучин, ул. Я. Купалы, 26 |
| Земельный участок, на котором расположен объект | Кадастровый номер 425850100003000331 (назначение – земельный участок для содержания и обслуживания жилого дома), площадью 0,1141, расположенный по адресу г. Щучин, ул. Я. Купалы, 26 |
| Начальная цена продажи | 19 045,50 р. (девятнадцать тысяч сорок пять рублей пятьдесят копеек) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 1904 р. (одна тысяча девятьсот четыре рубля) |
| Продавец | ОАО «Щучинагропродукт», 231513, Щучинский р-н, д. Янчуки, тел. 8-01514-411-79 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41-98-32 |
| Условия аукциона | Аукцион без условий |
| Условия оплаты | По договоренности сторон |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/сч для перечисления задатка | 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области БИК 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 03 марта 2017 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3-209.**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.

Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 04.08.2016**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 28 февраля 2016 г. до 15.00**

***Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»***

*http://grodnoino.by/*

# БЕЛАРУЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

сообщает о проведении 6 марта 2017 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

| Номер лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь, га | Инженерная и транспортная инфраструктура | Начальная цена, бел. руб. | Расходы по подготовке зем. документации | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Аукцион по продаже земельных участков гражданам в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома** | | | | | | |
| 1 | Минская область, Логойский район, Беларучский с\с, д. Корбачевка, земельный участок У-1, кадастровый номер 623280403601000063, целевое назначение земельного участка – земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (ПОВТОРНО) | 0,1037 | Возможность подключения к электроснабжению, подъезд с грунтовой дороги | 5 500,00 | 1 484,26 + публикация в газете | 550,00 |
| 2 | Минская область, Логойский район, Беларучский с\с, д. Корбачевка, земельный участок У-2, кадастровый номер 623280403601000064, целевое назначение земельного участка – земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (ПОВТОРНО) | 0,1015 | Возможность подключения к электроснабжению, подъезд с грунтовой дороги | 5 500,00 | 1 468,43 + публикация в газете | 550,00 |

Задаток (10% от начальной цены) перечисляется на расчетный счет №3600619011121 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 795, код платежа 4901, УНН 600181549, получатель – Беларучский сельский исполнительный комитет.

Аукцион состоится 6 марта 2017 года в 10.00 по адресу: Минская обл., Логойский район, д. Алекшицы, ул. Центральная, д. 17. Заявления на участие принимаются по рабочим дням с 8.00–13.00 с 14.00–17.00 по адресу: Минская обл., Логойский район, д. Алекшицы, ул. Центральная, д. 17. Последний день приема заявлений – 1 марта 2017 года до 17.00.

Контактные телефоны: (801774)58445, 58435, 58436

# БЕЛАРУЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

сообщает о проведении 20 марта 2017 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

| Номер лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь, га | Инженерная и транспортная инфраструктура | Начальная цена, бел. руб. | Расходы по подготовке зем. документации | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Аукцион по продаже земельных участков гражданам в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома** | | | | | | |
| 1 | Минская область, Логойский район, Беларучский с\с, д. Мочаны, ул. Заречная, д. 44А, земельный участок, кадастровый номер 623280406101000430, целевое назначение земельного участка – земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 0,1131 | Возможность подключения к электроснабжению, подъезд с грунтовой дороги | 9 000,00 | 1 913,92 + публикация в газете | 900,00 |
| 2 | Минская область, Логойский район, Беларучский с\с, д. Дубница, земельный участок У-10, кадастровый номер 623280406101000430, целевое назначение земельного участка – земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 0,1270 | Возможность подключения к электроснабжению, подъезд с грунтовой дороги | 4 750,00 | 1 382,04 + публикация в газете | 475,00 |

Задаток (10% от начальной цены) перечисляется на расчетный счет №3600619011121 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 795, код платежа 4901, УНН 600181549, получатель – Беларучский сельский исполнительный комитет.

Аукцион состоится 20 марта 2017 года в 10.00 по адресу: Минская обл., Логойский район, д. Алекшицы, ул. Центральная, д. 17. Заявления на участие принимаются по рабочим дням с 8.00–13.00 с 14.00–17.00 по адресу: Минская обл., Логойский район, д. Алекшицы, ул. Центральная, д. 17. Последний день приема заявлений – 14 марта 2017 года до 17.00.

Контактные телефоны: (801774)58445, 58435, 58436

# НА ВУЗКАЙ ДАРОЗЕ




Пачаць гэты расказ хацелася б прыгожа. Напрыклад, словамі рускага класіка: «Мороз и солнце, день чудесный!..» Альбо беларускага: «Надышлі марозы, рэкі закавалі...» Аднак і першае, і другое ў тую зіму здаралася рэдка, значыць, расказ пачну без вершаў.

Дзядзька Іван быў чалавекам вельмі майстравым: ён, што называецца, з нічога і сваімі рукамі чаго толькі не зрабіў? Сабраў, у прыватнасці, трактар. Няхай без кабіны, няхай без глушыцеля, але ж ён вёз — і гаспадара, і ўсё, што той пакладзе...

Дык вось. Адным цёплым лютаўскім днём вырашыў Іван паехаць у лес па дровы. Ускінуў на плечы целагрэйку, на макаўку — шапку-аблавушку, заткнуў за пояс сякеру і завёў стальнога каня.

Ехаць да лесу было далекавата — кіламетраў з пяць і там яшчэ парачку. Але ж у такое прыгожае надвор'е адлегласці Іван не заўважаў. Трактарок яго роўненька, хоць і на ўсю ваколіцу лапатаў, на кожнай ямінцы гаспадара свайго лёгка падкідваў, «вушамі» ад шапкі вецер ганяў...

Што важна, вушы ў Івана былі адкрытыя...

І тым не менш за грукатам ён не чуў, што на вузкай дарозе, ззаду за ім, амаль ад самай вёскі, прыстроіўся «жыгулёк» з трыма хлопцамі-пасажырамі. Куды яны ехалі і чаго, ці моцна спяшаліся, гісторыя змоўчвае, а я прыдумваць не буду. Але ж факт, што абагнаць Іванаву тарахцелку яны вельмі хацелі і дзеля гэтага чаго толькі не рабілі: і сігналілі трактарысту, і фарамі міргалі, і крычалі-галёкалі, і свісталі... У адказ ява бачылі адно — вясёлае калыханне «спіны» ды «вушэй» у шапцы.

Толькі ў лесе хлопцы неяк злаўчыліся — заехалі наперад, абагналі самаробны трактар і, загарадзіўшы дарогу, сталі. Іван спыніўся таксама: як нічога ніякага пайшоў да людзей.

Думаеце, атрымаў па шапцы?

Не, тады яшчэ завядзёнак такіх не было. Хлопцы проста вылезлі з машыны, рушылі насустрач трохі здзіўленаму Івану, парукаліся. Адзін пры гэтым заўсміхаўся, разглядаючы трактар, другі — паляпаў умельца па плячы, трэці — самы сур'ёзны, кіроўца, апусціў у Іванавай шапцы вушы і надзейна, на два вузлы, пад самай шыяй завязаў іх.

Пасля гэтага хлопцы моўчкі селі ў свае «жыгулі» і паехалі.

Дзядзька паспрабаваў быў развязаць вузел — навобмацак не атрымалася, а люстэрка пры сабе ён не меў. Паспрабаваў быў парваць завязкі — дудкі: хтось прышыў як сабе. Была думка неяк скарыстацца сякерай... Не прылаўчыўся...

Так і працаваў бедны, — мокры, як мыш... Ведама — дровы... З пілой, з сякерай...

І дамоў потым ехаў, як першакласнік — з завязанымі вушамі.

Добра, што жонка ў хаце была: уратавала небараку, а то і еў бы ў шапцы.

... Змяніліся цяпер і часы, і норавы. Мала такіх людзей, як Іван, як яго спадарожнікі. Не носіць амаль ніхто шапак-аблавушак са штучнага футра. Няма і такіх прыгожых пагодных зім.

Але ж гэта было, як і гісторыя, якую я расказаў.

**Генадзь Рыняк,** *г. Бялынічы.*

# ЛЮБОЎ НЕ БЛІНЦЫ...

Непадалёк ад нас, у суседніх вёсках жылі два былыя аднакласнікі, якія трымалі сабак. У аднаго быў прыгажунчык Рэкс, чыстапародная аўчарка, у другога — трохі... падобная на яе (то-бок на аўчарку) сучка Лада. Не скупілася яна — час ад часу прыводзіла гаспадару досыць мілых шчанят, але ж, можна сказаць, «двортэр'ераў». А яму хацелася, каб пародзістых, каб і сабе нарэшце «хлопчыка» пакінуць, і іншым прапанаваць.

Гаспадар казаў гэта Ладзе і нават не раз, яна слухала, але ж, падобна, не чула, бо па-ранейшаму выбірала «кавалераў» не цвярозым розумам з мэтай палепшыць пароду, а парывамі душы (як, дарэчы, і большасць істот жаночага полу). А ў выніку ў кожны новы прыплод «цешыла» то рабенькай поўсцю, то абвіслымі вушамі, то крывымі лапамі...

«З гэтым трэба нешта рабіць», — лічыў гаспадар і нават дадумаўся, што канкрэтна: ён дамовіўся са сваім аднакласнікам «пазнаёміць», «сасватаць» сабак.

Правілы этыкету пасля непрацяглых дэбатаў мужчыны вырашылі адкінуць: наладзіць сустрэчу на тэрыторыі «кавалера».

Сказана — зроблена: вечарам пэўнага дня, разагнаўшы з падворка ўсіх прэтэндэнтаў на Ладзіны лапу і сэрца, гаспадар вывеў сваю, як яму здавалася, надзейна схаваную «нявесту», пасадзіў яе ў каляску ІЖа і адправіўся ў суседнюю вёску.

Абуранае гэтым учынкам сабачае «вяселле» (і як толькі ўнюхалі?!) дружна рушыла следам: «ганаровы эскорт» складаўся з добрага дзясятка асобін.

Ладзін гаспадар, убачыўшы гэта, вырашыў уцячы, паддаць газку — думаў, што «світа» адстане. Ды дзе там: амаль упоравень з матацыклам «каціўся» нават самы маленькі з сабак — белалапы Шарык! Прычым — аж да сялібы Рэкса...

Далей за брамку мужчыны «эскорт» не пусцілі, наадварот — шуганулі так...

Ладу адну павялі ў гумно. Туды ж следам запусцілі Рэкса. Гаспадары абодвух сабак праз шчыліну ў дзвярах яшчэ «адсачылі» працэс «знаёмства»: тыя абнюхаліся, трэба разумець адно да аднаго паставіліся прыязна? А значыць, мужчынам падалося, што справа зроблена, бо «маладыя» ж засталіся навач...

Што далей было — таямніца, пакрытая цемрай, — і ў прамым, і ў пераносным сэнсе. Бо першае, што раніцай і яшчэ на подступах да гумна згледзелі «сваты», — быў падкоп пад дзвярыма.

Не ўсцешыла і тое, што ўбачылі потым: на сене соладка спаў прыгажунчык Рэкс. «Нявесты» і след прастыў.

Але ж надзею гаспадару яго Лада пакінула, прычым аж да той пары, пакуль не прывяла пяцярых здаровенькіх тоўсценькіх шчанючкоў. Кожны з іх «цягнуў» на аўчарку — чыстапародную... Калі б не рыжая афарбоўка і не белыя «шкарпэтачкі-гольфікі» — якраз як на лапках у Шарыка.

**Алена Несцяронак,** *г. Докшыцы.*

# ЧАРОЎНЫЯ ЧАРАВІКІ

...Шчыра кажучы, маладыя вяскоўцы жылы цяпер не рвуць. І сапраўды: навошта трымаць карову, калі ў краме і малако, і смятана, і тварог з ёгуртам? І парасят навошта купляць, калі на іх то грып, то чума, то яшчэ якая бяда? Пусцеюць падворкі. Дык, значыць, і гароды паменшыць можна — сотак да пяці?

Праўда, і дзякуй богу, думаюць так не ўсе. Ёсць яшчэ, засталіся ў тутэйшых вёсках «дыназаўры»: не адмовіліся яны, трымаюць жывнасць. А для гэтага кожную вясну садзяць гоні бульбы ды сеюць збожжа. І, вядома ж, потым убіраюць усім не рыдлёўкамі і не сярпамі. Ім на дапамогу (клопатам дырэктара гаспадаркі) прыходзіць спецыяльная тэхніка. І, напрыклад, за штурвалам камбайна тады важна сядзіць Віцёк.

Да вяскоўцаў на прыватныя гоні ён, вядома ж, едзе не хаўтурыць: на працы чалавек знаходзіцца, яму заробак ідзе. І людзі пра гэта ведаюць, але ж самі таксама разлічыцца хочуць — аддзячыць чалавеку той жа бутэлечкай вінца альбо першаку. Віця гэтых гасцінцаў не просіць, ён проста не адмаўляецца. Але ж каб сесці піць... Ды Божа барані! Гэта — хіба пасля працы.

Дык вось. Закончыў ён уборку ў суседнім сяле, паставіў камбайн і толькі тады падаўся да хлопцаў, каб разам адзначыць дажынкі.

Выпіць у іх было што, закусіць — таксама, адзінае — чаравікі. Гарачыя і цяжкія, яны яшчэ зранку абцугамі сціскалі ногі, а ўжо бліжэй да вечара... Ступні ў іх аж гарэлі!

Віця рады быў, што разуўся. А яшчэ — што нарэшце дажынкі, можна сказаць, свята, што добрая кампанія, што выпіўка ёсць і закуска, што... «Зорка Венера ўзышла над зямлёю».

Карацей, у той вечар жонка ледзь прыждала яго.

Але ж прывеціла, заўважыла яшчэ, што муж кіслы нейкі, спытала, чаго?

— Ды вось, — уздыхнуў гаспадар, — быў конь ды, мусіць, з'ездзіўся. Захварэў я, падобна... Прыйдзецца да доктара заўтра ехаць: ногі ў ступнях — як сабакі рвуць!

— А Божухна! Ты ж нічога не казаў, — захвалявалася гаспадыня. — Ты ж раніцай з хаты як быццам здаровы пайшоў. Што ж з тваімі нагамі зрабілася? Не трымаюць?

— Не.

— То сядай хутчэй.

Віцёк памалу, асцярожненька апусціўся на канапу. Хацеў быў разуцца — жонка апярэдзіла:

— Давай дапамагу. Бедненькія ножкі...

Прысела ля іх і тут жа ўстала:

— Не дзіва, што яны баляць! Ты ж вочы разуй — паглядзі, як абуўся: на правай назе левы чаравік, а на левай — правы. Скідай... Як бачыш палягчэе. Можа і да доктара ехаць не спатрэбіцца.

Як у ваду кабета глядзела: боль амаль што сціх, прычым — у той жа вечар.

...Аднак тыя цесныя і цяжкія чаравікі Віцёк усё роўна не выкінуў, бо... чароўныя, бо дадому, да жонкі прывялі, нягледзячы на тое, што на правай назе быў левы, а на левай — правы.

**Альфрэд Тычко,** *в. Ідолта, Мёрскі раён.*

**Рубрыку вядзе**
**Валянціна ДОЎНАР.** *dounar@zviazda.by*

■ Неасабісты суб'ектыў

# САЛОДКІ ВОЦАТ



## Чаму «халява» не спрацоўвае

АКУРАТ у Дзень святога Валянціна, калі чакаеш нечага прыемнага і незвычайнага, я атрымала пісьмо на электронную пошту. Адрас адпраўшчыка быў абсалютна незнаёмы, але пачатак вельмі інтрыгаваў, таму ўзялася чытаць. «Камплімент у гэты дзень для вас. Я наткнуўся на свой профіль і электронны кантакт пры пошуку шчырага знешняй асобы, які можа дапамагчы мне. Я пасылаю вам гэты ліст са слязамі, смутку і глыбокай эмацыянальны болем у маім сэрцы. Я ведаю, што гэты ліст прыйдзе да вас, як здзіўленне, так як мы не ведалі, ці сустрэць адзін аднаго перад тым, улічваючы той факт, што я знайшоў ваш электронны кантакт праз Інтэрнэт у пошуках даверанай асобы, якое можа аказаць вялікую дапамогу мне.

Я Majok Джон Garang з Рэспублікі Судан, сын нябожчыка д-ра Джона Гаранг. Перад смерцю майго нябожчыка бацькі ў Угандзе на 31 ліпеня 2005 года ён быў віцэ-прэзідэнтам і былы лідэр паўстанцаў Судана і быў забіты прэзідэнт Судана Амар аль-Башыр у авіякатастрофе верталёта. Вы можаце прачытаць больш пра майго бацьку ў спасылы ніжэй. Я вымушаны звязацца з вамі ў выніку дрэннага звароту, які быў для мяне, вынесены на маёй мачахі. Яна ўзяла казначэйства і ўласцівасці ўсіх майго нябожчыка бацькі і хацеў забіць мяне на некалькі выпадкі жыцця, але Бог выратаваў мяне ад сваіх злых участкаў, такім чынам, я выратаваўся. У той жа час, я хацеў бы паехаць у Еўропу, але яна схавацца ад майго пашпарта і іншыя каштоўныя дакументы. На шчасце, яна не пазнаць, дзе я трымаў файл майго бацькі, які утрымліваў важныя дакументы. Зараз я ў цяперашні час знаходжання ў Сенегал ў якасці бежанца ў адпаведнасці з Высокай камісіяй Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па справах бежанцаў».

ВОСЬ табе і «кампалімент! Звычайнае «нігерыйскае пісьмо», адзін з распаўсюджаных відаў махлярства, пра які не ведае толькі лянівы. Атрымлівала такое «шчасце» не раз, і па-англійску, і па-руску. Выходзіць, махляры ўдасканальваюцца: убачыўшы беларускіх дамен у адрасе, пішуць ужо на нашай мове. Як — іншая справа (у прыведзеных цытатах захаваная арфаграфія арыгінала). Але сэнс сумнай гісторыі беднага афрыканскага хлопца, якога пасля смерці бацькі затуркала і пазбавіла ўсяго злая мачаха, у агульных рысах зразумелы. Нацыскнуўшы на жаль і спачуванне адрасата, махляр пачынае яго спакушаць. Маўляў, бацька пакінуў на захоўванне суму 9 мільёнаў 700 тысяч долараў у адным з лонданскіх банкаў, адкрыўшы дэпазіт на імя сына. Але ж бедны сын — бежанец, а пашпарт у мачахі, і, калі ёй паведаміць пра гэтыя грошы, яна іх забярэ. Таму бедны Джон прапануе мне стаць яго даверанай асобай. Пасля ён зменіць месца жыхарства на Беларусь і мы разам тыя грошы з англійскай сталіцы забяром. За гэтыя клопаты ён мне абяцае 20 працэнтаў ад сумы, а ўсе астатнія сродкі ён мае намер інвеставаць у найбольш паспяховыя прадпрыемствы Беларусі, якія я маю парэкамендуе... Карацей, калі я клапачуся не толькі пра свой дабрабыт, але і дабрабыт сваёй краіны, я проста павінна напісаць Джону адказ, што я згодна, і тады ён мне прышле ўсе дадатковыя звесткі, якія мне спатрэбяцца ў гэтай нялёгкай, але высакароднай справе...

Я яму адказала. Маўляў, згодная толькі на 50 працэнтаў і ніяк не менш. Джон аказаўся шчодрым хлопцам і тут жа згадзіўся. Праўда, прыслаў нумар рахунка, на які я павінна перавесці 10 тысяч долараў, каб небарака змог выбрацца з Сенегала, дабрацца да Мінска і аформіць неабходныя дакументы. Апетыт Джона, варта сказаць, мяне расчараваў: 10 тысяч — зусім дробязь у параўнанні з без малога пяццю мільёнамі, якія ён мне абяцаў. Каб атрымаць гэту суму, паводле сцэнарыя, я павінна прадаць апошняе, залезці ў даўгі, але знайсці і хуценька пасласць на рахунак яўна не беларускага банка тыя няшчасныя дзесяць тысяч...

На гэтым наша перапіска, вядома ж, скончылася (я і адказала на тое «пісьмо шчасця», каб даведацца, на якую першапачатковую суму разлічваюць махляры). Пакінула сябе без надзеі стаць доларавай мільянеркай, сваю краіну — без такіх патрэбных ёй інвестыцый, махляроў — з дуляй. Сяджу цяпер задаволеная і разважаю: як увогуле на такое можна купіцца? Зразумела ж, што падобныя пісьмы — звычайны развод на грошы. Якім дурнем трэба быць, каб увязацца ў гэту аферу, адправіўшы махлярам сваю асабістую інфармацыю ці, што ўвогуле ў галаве не ўкладваецца, — пералічыўшы на іх рахунак грошы...

БІЗНЕС у махляроў вельмі прыбытковы, а грошы ім паступаюць з усяго свету. У ЗША, напрыклад, падлічылі, што агульная колькасць страт ад «нігерыйскай пошты» склала 100 мільёнаў долараў. І гэта пры тым, што ў свеце патрачана больш за пяць мільёнаў долараў толькі на інфармацыйную кампанію супраць афрыканскіх махляроў. Ды што амерыканцы — наіўныя дзівакі, якіх абдурыць не так складана. А вось чаму на гэты кручок каторы год трапляюць справдеку асцярожныя беларусы? Здаецца, ужо і немаўля ведае, што пісьмы ад «удавы афрыканскага дыктатара» і СМС-паведамленні (а сёння махляры ўжо адпрацоўваюць і Вайбер) аб выйграным шыкоўным аўтамабілі — «ліпа», мэта якой — выцягнуць з вас як мага больш грошай. У нас на сайце Міністэрства ўнутраных спраў у раздзеле «Злачынствы, ахвярамі якіх сталі грамадзяне», пра падобныя аферы расказваецца вельмі падрабязна, з канкрэтнымі прыкладамі, змешчаны нават магчымыя варыянты «нігерыйскіх пісьмаў». Чаму ж тады на гэтым самым сайце ў рубрыцы «Здарэнні» не часта, але пастаянна з'яўляюцца паведамленні аб чарговай ахвяры падобных махлярстваў? (Здаецца, восенню была на слыху гісторыя жанчыны, якая пералічыла кругленькую суму на дарогу «багатаму нашчадку мільёнаў», які, акрамя працэнтаў, абяцаў ёй яшчэ руку і сэрца.) Што нам у пэўны момант засціле вочы і розум?

Мяркую, звычайная чалавечая сквапнасць. Як толькі замаячыць на гарызонце саладзейшае за халву чароўнае слова «халява», мозг проста адключаецца, пачынаюць дзейнічаць інстынкты. Такое здараецца з усімі, святых сярод людзей няма. Але ў кагосьці гэта праходзіць за імгненні, а ў некага становіцца мэтай жыцця. Вось тады і пачынаецца перапіска з суданскім сіратой, які абяцае мільёны долараў. Або забег па супермаркеце і змітанне з паліц усіх акцыйных тавараў (нярэдка зусім не патрэбных), бо яны ўдзельнічаюць у розыгрышы машыны або кватэры. Прынцыповай розніцы паміж адным і другім ніякай, бо матываацыя аднолькавая: як, уклаўшы дробязь (ці фактычна зусім нічога), атрымаць у разы, у дзясяткі разоў больш.

ПАСЛЯ, падлічваючы страты і давячыся нясмачным шакаладам (кватэру не выйгралі, а ён жа — дзесяць плітак — усю паліцу займае), пачынаем Усявышняму або лёсу задаваць пытанні «чаму?» і «за што?». Нібы ніколі дагэтуль не чулі і не ведалі, што кожнаму — па яго ўласных справах. І па яго ўласным выбары.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*

■ Родныя тапонімы

# СІНЯЯ ГАРА І СІНЯЕ БАЛОТА

*«Мая бабуля нарадзілася ў вёсцы Сінія Горы Смалявіцкага раёна. Раскажыце, калі ласка, пра назву гэтай вёскі».*

**Сцяпан Таболіч,** *Мінск.*



**На пытанні адказвае старшыня Рэспубліканскай тапанімічнай камісіі пры НАН Беларусі Ігар КАПЫЛОЎ.**

На першы погляд парадаксальным можа падацца той факт, што ў Беларусі, тэрыторыю якой амаль на 75 працэнтаў займаюць раўніны і нізіны, налічваецца даволі вялікая колькасць тапонімаў з асновай *гара: вёскі Барань-Гара, Бярозавая Гара, Горкі, Красная Горка, Лысая Гара, Гараватка, Горная Рута, Гаравец, Гаравін і многія іншыя.* Насамрэч ніякага парадоксу ў гэтым няма. Паводле вядомага ў анамастычнай навуцы «закона адноснай негатыўнасці», сфармуляванага яшчэ ў шасцідзясятыя гады дваццатага стагоддзя вядомым тапаністам В.А. Ніканавым, уласныя геаграфічныя назвы звычайна даюцца не па характэрнай, а па рэдкай прыкмеце мясцовасці, якая выдзяляе названы аб'ект з навакольнага асяроддзя. У такім разе абсалютна заканамерна, што беларусы гарамі называлі любыя ўзвышшы на раўніннай і нізіннай мясцовасці. Такім чынам, асноўны кампанент (Горы) у назве вёскі *Сінія Горы* мае празрыстую матывацыю. Больш загадкавым можа падацца азначальны кампанент — *Сінія.* Але і ён мае сваё навуковае тлумачэнне.

Каляровыя абазначэнні — тыповая з'ява для тапаніміі Беларусі. Найбольш шырока адзначаюцца тапонімы, у складзе якіх ёсць прыметнік *белы (Белы Мох, Белыя Лужы),* масава прадстаўлены назвы з кампанентам чорны *(Чорны Ручай, Чорны Засценак),* нярэдка сустракаюцца назвы, у структуры якіх маюць месца прыметнікі *зялёны (Зялёны Востраў, Зялёны Прудок)* і *чырвоны (Чырвоныя Нівы, Чырвонае Поле).* Арэал ужывання прыметніка *сіні* ў назвах населеных пунктаў ахопліває ўсе рэгіёны нашай краіны: пасёлак *Сіні Востраў* (Веткаўскі раён Гомельскай вобласці), пасёлак *Сіняе Мора* (Рагачоўскі раён Гомельскай вобласці), пасёлак *Сіняк* (Салігорскі раён Мінскай вобласці), вёска *Сіняўка* (Клецкі раён Мінскай вобласці), вёска *Сіняя Гара* (Валожынскі раён Мінскай вобласці), пасёлак *Сіняе Балота* (Краснапольскі раён Магілёўскай вобласці), вёскі *Сіні Калодзеж* і *Сіняя Слабада* (Слаўгарадскі раён Магілёўскай вобласці), хутар *Сіні Ручай* (Астравецкі раён Гродзенскай вобласці), вёска *Сіні Камень* (Гродзенскі раён), хутар *Сіняўшчына* (Глыбоцкі раён Віцебскай вобласці), вёска *Сінянка* (Гарадоцкі раён Віцебскай вобласці). Старажытная гісторыя, колеравая сімволіка, глыбокі жыццёвы сэнс і народная мудрасць адлюстраваны ў кожнай з гэтых назваў. Шкада, што многія з іх ужо сёння зніклі з карты Беларусі і перайшлі ў разрад страчаных назваў.

Даволі шырокі спектр найменняў з кампанентам *сіні* адзначаецца не толькі ў айканіміі (уласных назвах населеных пунктаў), але і ў беларускай мікратапаніміі (уласных назвах дробных геаграфічных аб'ектаў). Пры гэтым у многіх выпадках вядома матывацыя найменняў. Так, затока *Сіняя Даліна* на Мазыршчыне атрымала сваю назву з-за таго, што вада тут чыстая, з сінім адценнем. У мясцовых жыхароў, па сведчанні даследчыц мікратапаніміі рэгіёна А.А. Івановай, прыкмета *сіні* ў адносінах да вады звязваецца з панццем «чысты», «празрысты». На Краснапольшчыне месца ў лесе называецца *Сіняе Балота* з той прычыны, што тут расце шмат чарнічніц, а *Сіняе Поле* ў Слаўгарадскім раёне назвалі так таму, што ў летнюю пару яно пакрыта васількамі. Цікавыя назвы мікрааб'ектаў зафіксавалі навукоўцы Гродзенскага ўніверсітэта на тэрыторыі сваёй вобласці: паляна *Сінячыха* (на ёй растуць грыбы — сінякі), сенажаць *Сінюкоўшчына* (належала братам Сінюкам), паша *Сіняк* (тут вельмі неўрадлівая глеба — сіняк), пагорак *Сіняя Гара* (на ім пясок сінявата колеру). Недалёка ад вёскі Суботнікі Іўеўскага раёна ёсць урочышча з назвай *Сіняе Вока.* Вокам у гэтай мясцовасці называюць прорву, бездань у балоце, дрыгву. Не менш цікавыя назвы сустракаюцца на Міншчыне (глыбокая яма ў рэчцы *Сіняя Тонь*) і Брэстчыне (заліў на рэчцы *Сінія Бухты*). А назва ўрочышча *Сіні Востраў* на Гомельшчыне, відаць, узнікла таму, што на гэтым месцы рос яловы лес. А сінім ён называўся, на думку В.П. Лемцюговай, з той прычыны, што яго драўніна зміяшчае мала смалы.

Акрамя таго, нельга ігнараваць паданні і вераванні нашых продкаў, якія складаюць неад'емную частку традыцыйнай культуры беларусаў. Тым больш што амаль у кожным раёне Беларусі сустракаюцца ўзвышшы, якія маюць назву *Гара* або *Горка* ў спалучэнні з пэўным колерам. Так, Л. Дучыц і І. Клімковіч назву *Красная Горка* звязваюць з месцам, куды прыносілі дзяўчаты і маладыя жанчыны рытуальныя стравы і напоі, спажывалі іх, спявалі абрадавыя песні, вадзілі карагоды. На Чырвоных Гарах звычайна былі язычніцкія капішчы. Вельмі цікавую інфармацыю вучоныя-этнографы даюць пра горы, назвы якіх змяшчаюць азначальны кампанент *залатыя* або *сярэбраныя*: «У міфапаэтычнай карціне свету нашых продкаў ландшафтным аб'ектам нярэдка надаюцца паэтычныя азначэнні *залатыя* і *срэбныя,* што ў беларускім фальклоры ёсць сімвалам багацця, дастатку і асацыіруецца з Сонцам, Месяцам, жаночым ды мужчынскім пачаткамі, адпавядае вышэйшаму і ніжэйшаму свету, свету памерлых. Дык і не дзіва, што сустракаюцца і такія назвы, як Залатая і Срэбная Гара. Вельмі часта на іх месцяцца старыя могільнікі». Па сведчанні навукоўцаў, сіні колер у беларускай міфалогіі звязаны з архаічнымі ўяўленнямі аб замагільным свеце, з культам памерлых.

Назва *Сінія Горы* не адзінкавая. У Валожынскім раёне, па звестках Л. Дучыц, існуе мікратапонім *Сіняя Гара,* ад якога, у сваю чаргу, пайшла назва вёскі. Народнае паданне тлумачыць гэту назву тым, што гара дыміцца. Ёсць і іншае меркаванне адносна паходжання гэтай назвы: на гэтым месцы некалі была крыніца з празрыстай вадой. З назвай *Сінія Горкі* зафіксаваны таксама комплекс курганоў недалёка ад вёскі Саковічы ў Асіповіцкім раёне.

Такім чынам, прааналізаваўшы многія выпадкі ўжывання прыметніка *сіні* ў тапанімічнай сістэме Беларусі і супаставіўшы з іншымі колеравымі найменнямі, можна выказаць найбольш верагодныя дзве версіі ўзнікнення назвы вёскі *Сінія Горы.* Першая версія звязана з гаспадарчай дзейнасцю людзей, для якіх важна было адзначыць не толькі рэльеф мясцовасці, але і ступень урадлівасці глебы. Цалкам магчыма, што на ўзвышанай мясцовасці зямля была пясчаная, і адпаведна яе неўрадлівы (сіні) характар быў адлюстраваны ў назве геаграфічнага аб'екта. Другая версія можа мець сувязь з міфапаэтычнай творчасцю насельнікаў гэтай мясцовасці, якія, магчыма, узнікненне гары звязвалі з месцам старажытнага пахавання. Але канчатковую і больш дакладную разгадку паходжання назвы можна адшукаць толькі на месцы, звярнуўшы ўвагу на характар раслінасці, якасць глебы, а таксама ўважліва паслухаўшы аповеды старажылаў.

***P.S. Шаноўныя чытачы!***

***Вас цікавіць, што азначае назва горада, вёскі ці мястэчка, у якіх вы жывяце? А можа, той мясцовасці, адкуль вы родам? Вам хочацца ведаць, адкуль пайшлі найменні пэўных урочышчаў, лясоў, азёр, што размяшчаюцца ў вашай мясцовасці? Тады дасылайце свае лісты з пытаннямі на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, газета «Звязда». Або па электроннай пошце: nina@zviazda.by з пазнакай «Родныя тапонімы».***

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.25 | 18.23 | 9.58 |
| Віцебск — | 8.17 | 18.09 | 9.52 |
| Магілёў — | 8.15 | 18.13 | 9.58 |
| Гомель — | 8.08 | 18.13 | 10.05 |
| Гродна — | 8.39 | 18.39 | 10.00 |
| Брэст — | 8.36 | 18.43 | 10.07 |

### Месяц

***Апошняя квадра 18 лютага.***

***Месяц у сузор'і Скарпіёна.***

### Імяніны

***Пр.*** *Абрама, Аляксандра, Аляксея, Георгія, Івана, Кірылы, Мікалая, Сяргея, Фёдара, Юрыя.*
***К.*** *Сусанны, Аляксея, Лукаша, Расціслава.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Дзяўчына пытаецца ў хлопца:**

**— Мікола, я хвалююся: ты перастаў мне пісаць. Што здарылася?**

**— Ды я, Маша, піць кінуў...**

Праблема жанчын раніцай — зрабіць прычоску, нафарбавацца, падабраць туфлікі, капялюшык пад сумачку. Потым зразумець, што паліто не пасуе, і тройчы пераапрануцца, пры гэтым падбягаючы кожныя тры хвіліны да люстэрка.

Праблема мужчын — знайсці гэтую чортаву другую шкарпэтку!

**Гутарка двух катоў:**

**— Ты чаму гуляць не прыходзіш?**

**— Працую шмат, да нас госці прыехалі, пакуль усё мяне перагладзяць, так стамляюся, так стамляюся...**

Каб скура рук не лушчылася ад марозу, вазьміце палову лімона, дробку солі, бутэльку тэкілы і не выходзьце на вуліцу.




Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

## Даты Падзеі Людзі

**17 ЛЮТАГА**

**1837** год — нарадзіўся (в. Ляды, цяпер у Чэрвеньскім раёне) Канстанцін Міхайлавіч Ельскі, беларускі вучоны-біёлаг, географ, геолаг, падарожнік. У 1860 годзе скончыў Кіеўскі ўніверсітэт. Працаваў у Французскай Гвіяне, Перу, Турцыі, Германіі і Францыі. Аўтар кніг «Папулярна-прыродазнаўчыя апавяданні пра знаходжанне ў Французскай Гвіяне і часткова ў Перу». У гонар Ельскага названы адзін від лаўра і некаторыя віды птушак і звяроў. Памёр у 1896 годзе.

**1867** год — нарадзіўся Пётр Пятровіч Шміт, рускі марскі афіцэр, рэвалюцыйны дэмакрат, адзін з кіраўнікоў Севастопальскага паўстання 1905 года. Па прапанове рэвалюцыйных матросаў прыняў на сябе камандаванне крэйсерам «Ачакаў». Пасля паражэння ў жорсткай бітве крэйсера і іншых караблёў, якія падтрымалі паўстанне, з урадавай эскадрай П.П. Шміт быў аддадзены пад суд і асуджаны да смяротнага пакарання. Расстраляны 19 сакавіка 1906 года.



**1900** год — нарадзіўся Фёдар Пятровіч Вінакураў, вучоны ў галіне гідратэхнікі, заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі Беларусі, акадэмік НАН Беларусі, акадэмік Акадэміі будаўніцтва і архітэктуры СССР. У 1954—1956 гадах — міністр меліярацыі і воднай гаспадаркі БССР. Распрацоўваў пытанні праектавання і будаўніцтва комплексаў гідратэхнічных збудаванняў, механікі тарфяных грунтоў. Аўтар праектаў і кіраўнік каля 20 будаўнічых комплексаў, якія маюць важнае народнагаспадарчае значэнне. Апублікаваў больш за 50 навуковых работ. Памёр у 1990 годзе.

**1932** год — англійскі фізік Джэймс Чэдвік адкрыў нейтрон (Нобелеўская прэмія за 1935 год). Пачатак сучаснай ядзернай фізікі.

### Было сказана

**Ніл ГІЛЕВІЧ, народны паэт Беларусі:**

*«А па зямлі ўсе сцелюцца дарогі —*
*Гасцінцы, магістралі, бальшакі —*
*Не для пакут, не для людской трывогі —*
*Для радасці і шчасця на вякі».*

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 684.

Нумар падпісаны ў 19.30 16 лютага 2017 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12